**Канавалава І.У. (Мінск)**

## Некаторыя асаблівасці ўтварэння прыслоўяў у гаворках Міншчыны

Дыялектная мова – адна з самых першых і асноўных крыніц узбагачэння літаратурнай мовы. У сваіх творах беларускія пісьменнікі выкарыстоўваюць дыялектную лексіку вельмі шырока. Яна – адлюстраванне народнай мудрасці і дасціпнасці. Колькі надзвычай цікавых адкрыццяў можна зрабіць, пранікнуўшы ў глыбіні дыялектнага слова.

Прыслоўе – адна з тых часцін мовы, якая выклікае асаблівую цікавасць пры яе вывучэнні, тым больш у дыялектнай мове. Найбольш важна для сучаснай лінгвістычнай навукі даследаваць адметнасці словаўтварэння прыслоўяў у беларускіх гаворках на Міншчыне.

Самым прадуктыўным спосабам утварэння прыслоўяў на адзначанай тэрыторыі выступае марфалагічны спосаб, у якім, як вядома, вылучаюцца тры разнавіднасці: афіксацыя, бязафіксны і кампазіцыя. У сваім выступленні мы падрабязна спынімся толькі на афіксацыі як найчасцей выкарыстанай у народных гаворках мадэлі ўтварэння новых прыслоўяў.

Афіксацыя аб'ядноўвае суфіксальны, прыставачна-суфіксальны і прыставачны спосабы. Пры **суфіксальным утварэнні** прыслоўяў выразна вылучаюцца дзве групы наватвораў: 1) прыслоўі, якія страцілі непасрэдную сувязь з адпаведнымі формамі зменных часцін мовы, і 2) прыслоўі, што захоўваюць такую суадноснасць.

Прыслоўяў, якія страцілі суадноснасць са зменнымі часцінамі мовы, у беларускіх гаворках на Міншчыне зафіксавана адносна няммога. Як прыклад такіх наватвораў можна прывесці групу адзайменнікавых дэрыватаў *анадое, усягды, нігды, нагды* з каранёвымі элементамі **ан-, ус- (вьс-), н-** і суфіксам **-е, -ы**. *А што вы думаеце, мы анадое і ў Мінск с канцэртам езьдзілі.* (Лявонавічы Нясвіж., МММГ, 1, 13); *Нагды дождж ідзе вялікі, а нагды маленькі* (Бесяды Лагойск., МММГ, 1, 82).

У групе прыслоўяў, якія захавалі суадноснасць са зменнымі часцінамі мовы, вылучаюцца прыслоўі, суадносныя з формамі В. скл., Т. скл., М. скл.

**Прыслоўі, суадносныя з формамі В. скл.,** утвораныя ад невытворных якасных прыметнікаў: *смяла, брыдка, рана, тошна, поўна, густа*. *Цяпер, калі вайны німа, спіш сьмяла* (Такарышкі Іўеў., МММГ, 1, 126); *Столькі гора пяражыла, што ўспамінаць тошна станя* (Жораўкі Пухавіц., МММГ, 1, 135). Акрамя таго, у якасці ўтваральнай асновы шэрагу дыялектных прыслоўяў выкарыстаны вытворныя прыметнікі: *аднакава, гадка, фацэтна, сільна, сібірна, бязбрэжна, злагадна, спаважна. Усе аднакава жывуць у нас* (Дукора Пухавіц., МММГ, 1, 12); *Яна гадка гаворыць* (Дукора Пухавіц., МММГ, 1, 35); *Вельмі фацэтна арцісты выступалі, усе сьмяяліся*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(Комлеўшчына Клец., МММГ, 1, 144); *Наша нявестка сібірна б'е дзяцей* (Цялякава Уздзен., МММГ, 1, 122); *Яна бязбрэжна сябе вяла* (Дукора Пухавіц., МММГ, 1, 26); *Зьнячэўку пасьлізнуўся і нагу зламоў* (Цялякава Уздзен., МММГ, 1, 57); *Некалі хлопцы злагадна жылі, вогэдак як і вы* (Цялякава Уздзен., МММГ, 1, 56); *Васіль спаважна рабіў* (Цялякава Уздзен., МММГ, 1, 126).

Да асобнага словаўтваральнага тыпу адносіцца прыслоўе *трэйчы*. Тут вылучаецца аснова зборнага лічэбніка (трэј-) і суфікс **-чы**. *Трэйчы хадзіла, пакуль выпісалі сена* (Цялякава Уздзен., МММГ, 1, 137).

Пры дапамозе суфікса **-мо** ад дзеяслоўнага кораня ўтворана прыслоўе *дармо*. *Дармо, што белка дурная, але рабіць усё ўмея* (Дукора Пухавіц., МММГ, 1, 44).

Вылучаюцца таксама прыслоўі з т. зв. "пустымі" суфіксамі (П.П. Шуба) **–сь, -ся, -чы, -і (а)**. *Учарась свайму панчошкі зьвязала* (Ваўкалака Докшыц., МММГ, 1, 144); *Учорачы вельмо ж горача было* (Рудня Чэрвеньск., МММГ, 1, 144); *Калі ж гэта бацька прыехаў? Цеперсі ўжо* (Якшыцы Клецк., МММГ, 1, 147); *Толечка мы прыехалі зь лесу, як прыбегла сусетка* (Цялякава Уздзен., МММГ, 1, 135).

**Прыслоўі, суадносныя з формамі Т. скл.,** маюць наступныя словаўтваральныя падтыпы: 1) з суфіксам **-ом (-ам, -ём)**: *кругом, днём, концам, вобцусам, атрубам, прытачкам*. *Як атрэжу хлеба кругом булкі, дык хопіць усім* (Дукора Пухавіц., МММГ, 1, 68); *Мне сягоньня концам трэба да мамы схадзіць* (Чанавічы Нясвіжск., МММГ, 1, 66); 2) з суфіксам **-аю, – яй**: *кучаю, нядзеляй*. *Вы ўсе кучаю, а я адна* (Дукора Пухавіц., МММГ, 1, 71); *У Ашмяну на кірмаш нядзеляй* (Кальчуны Ашмян., МММГ, 1, 88).

**Прыслоўі, суадносныя з формамі М. скл.,** таксама аб'ядноўваюць два словаўтваральныя тыпы: 1) прыслоўі з суфіксам **-е (-я)** і 2) з суфіксам **-ах**: *доле, заране, ладне, ценгле, вэндзя, серадня, пораўня, дарэмня, сягання, воддаля, таквеля, долях*. *Калі раніцай захоча спаць, кажуць – серадня пасьпіш* (Кальчуны Ашм., МММГ, 1, 122); *Глянь, таквеля што трымаецца.* (Масцілавічы Клец., МММГ, 1, 134); *Не сядзі доля, халодная яна* (Ракаў Валож., МММГ, 1, 46); *Ён даўно ўжо долях ляжыць* (Ямкавічы Валож., МММГ, 1, 46); *Я ўжэ не маладая, мне ладне гадоў* (Такарышкі Іўеўск., МММГ, 1, 71).

**Прыставачна-суфіксальны спосаб** аб'ядноўвае прыслоўі, якія суадносяцца з формамі Р. скл., В. скл., Т. скл. і М. скл.

**Прыслоўі, суадносныя з формамі Р. скл.,** складаюць некалькі дэрывацыйных груп, якія аб'ядноўваюцца агульнасцю прэфіксальнага элемента:

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

1) прыслоўі з прыстаўкай **з-** і адпаведнымі суфіксамі: *зноў, згуры, знячэўку. Зноў ты на гуліцы швэндаешся* (Масцілавічы Клецк., МММГ, 1, 56); *Рас вотку п'е – жыць нівазможно, згуры кідаць нада* (Савані Стаўбц., МММГ, 1, 55); *Зьнячэўку пасьлізнуўся і нагу зламоў* (Цялякава Уздзен., МММГ, 1, 57).

2) прыслоўі з прыстаўкай **да-, до-** і адпаведнымі суфіксамі: *даўлосу, досыць (до). Яны ходзяць даўлосу летам, хустак ні носяць* (Цялякава Уздзен., МММГ, 1, 44); *Харошы, добры дошч ноч хай палье і до будзе* (Такарышкі Іўеўск., МММГ, 1, 46).

3) прыслоўі з прыстаўкай **па-** і суфіксам **-ы**: *папары. Адумаўся, але ўжо папары* (Кальчуны, Ашмян., МММГ, 1, 96)

**Прыслоўі, суадносныя з формамі В. скл.**, групуюцца паводле агульнасці прыставак **на-**, **у-** і **пры-**. У групе прыслоўяў з прыстаўкай **на-** вылучаюцца прыслоўі, утвораныя:

1) ад асноў назоўнікаў і прыслоўяў з суфіксам **-і**: *нароссыпі, напракі, напамкі, навелічкі. Яна нароссыпі, у корасьці прывядзе дзевачку або хлопчыка* (Савані Стаўбц., МММГ, 1, 85); *Усё робіць напяраке, абы пасварыцца* (Цялякава Уздзен., МММГ, 1, 85); *Я паляджу, але мне ні напамке запытацц.* (Цялякава Уздзен., МММГ, 1, 84); *Навялічке ён дарма, ні вельмі малы* (Цялякава Уздзен., МММГ, 1, 82).

2) ад асноў назоўнікаў і прыслоўяў з суфіксам **-е**: *нарэшце, назаўтрае, наверсе, надаўжке. У яе тры дачкі, дак большая вышла замуж нарэсьце* (Цялякава Уздзен., МММГ, 1, 85); *Назаўтрае мама ўстала і пайшла ў сьвіран дабра курам пасыпаць* (Бясяды Лагойск., МММГ, 83); *Нехта ехаў наверсе на кані* (Цялякава Уздзен., МММГ, 1, 82); *Надаўшке добры гэты халат* (Цялякава Уздзен., МММГ, 1, 83).

3) ад асноў назоўнікаў з суфіксам **-у**: *напацёнку. С кіно ішлі напацёнку, дык страшна было* (Варняны Астравец., МММГ, 1, 84).

Прыслоўі з прыстаўкай **у-** ўтвораны:

1) ад асноў назоўнікаў з суфіксам **-і (-ы)**: *улукаткі, уцундры. Кап уцячы, трэба бехчы ўлукаткі* (Дукора Пухавіц., МММГ, 1, 141); *Паўлітру віна брась – тая бутылка ўцундры, разбілася, от што яна вырабіла* (Савані Стаўбц., МММГ, 1, 143).

2) ад асноў назоўнікаў з суфіксам **-у (-ю)**: *успулку, узімою, угару. У мяне яшчэ ёсьць брат і сястра. Жывуць паасобку. Успулку няма як жыць* (Такарышкі Іўеўск., МММГ, 1, 142); *Карова ўзімою на дзьве нагі кульгала* (Цялякава Уздзен., МММГ, 1, 140); *Зоўтра будзя марос, дым угару йдзе* (Цялякава Уздзен., МММГ, 1, 139).

Занатавана толькі адно прыслоўе з прыстаўкай **пры-** і суфіксам **-а:** *прыступна. У чумаках мякка, прыступна хадзіць* (Рудня Лагойск., МММГ, 1, 110).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пры ўтварэнні прыслоўяў, **суадносных з формамі Т. скл.**, выкарыстаны прыстаўка **з- (са-)** і суфікс **-ім (ём-)**: *саўсім, зусём. Ён саўсім быў няграматны, але ў салдатах навучыўся чытаць* (Дукора Пух., ММMГ, 1, 121); *У нас мост зусём благі, ніхто яго не правя* (Кальчуны Ашмян., ММMГ, 1, 57).

**Прыслоўі, суадносныя з формамі М. скл.**, складаюць дзве разнавіднасці:

1) прыслоўі з прыстаўкай **у-** і суфіксам **-е**: *уродзе. Уродзе мармуляды палучаецца.* (Ляшчынскія Мядзельск., ММMГ, 1, 142).

2) прыслоўі з прыстаўкай **па-** і суфіксам **-е**: *пасабе, паперадзе. Што мы пасабе будзям есьці?* (Цялякава Уздзен., ММMГ, 1, 97); *Ён жа паперадзі ўцёк* (Цялякава Уздзен., ММMГ, 1, 96).

**Прыставачны спосаб** аб'ядноўвае прыслоўі, утвораныя ад асноў прыслоўяў і назоўнікаў пры дапамозе прыставак **на-**, **у-**, і **по-**.

1) пры дапамозе прыстаўкі **на-** створаны *начыста, намітусь*. *Немцы начыста выграблі ўсё* (Ляшчынскія Мядзельск., ММMГ, 1, 86); *У мяне рукавіцы зьвязаныя намітусь* (Бытча Барыс., ММMГ, 1, 84).

2) пры дапамозе прыстаўкі **у-**: *уміг, уперад (упярот), угрунь, уперак. Парасята пакідаліся ўміх і ляжаць* (Цялякава Уздзен., ММMГ, 1, 141); *Уперат ён худзейшы быў, а цяпер трыбух у яго вырас* (Дукора Пухавіц., ММMГ, 1, 141); *Вунь мой маляц, угрунь пабех* (Халмоўка Барыс., ММMГ, 1, 140); *Уперак барануеш, каню цяжэй, але сабе лепш* (Малмыгі Вілейск., ММMГ, 1, 141).

3) пры дапамозе прыстаўкі **по-**: *посуха. Што гэто за кукуруза? Мачыла, мачыла, і то, кажацца, посухо* (Савані Стаўбц., ММMГ, 1, 106).

Такім чынам, словаўтварэнне прыслоўяў у беларускіх гаворках багацей за словаўтварэнне прыслоўяў у літаратурнай мове.

Прынятыя скарачэнні

ММMГ, 1. – Матэрыялы для слоўніка мінска-маладзечанскіх гаворак ; пад рэд. М.А. Жыдовіч. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1970. – 172 с.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ